**Дамарацкі, Э.** З дынастыі Вараб’ёвых / Э. Дамарацкі // Віцебскі рабочы. — 1987. — 27 сак. — С. 1.

## З ДЫНАСТЫІ ВАРАБ’ЁВЫХ



Сітуацыя ўзнікла не сказаць каб вельмі складаная, аднак усё ж далікатная. Вопытны механізатар Міхаіл Трошчанка рыхтаваў да жніва камбайн. Перадаць на некаторы час МТЗ галоўны інжынер прапанаваў іншаму трактарысту. Аднак Міхаіл Васільевіч заўпарціўся, не жадаў давяраць замацаваную за ім машыну чалавеку, якога лічыў не вельмі надзейным. Гаспадарскія адносіны Трошчанкі да тэхнікі ў калгасе добра ведалі, і яму прапанавалі самому рашыць, хто будзе працаваць на яго трактары ў час жніва. Міхаіл Васільевіч доўга не думаў, назваў камсамольца Юрыя Вараб'ёва, які па накіраванню калгаса вучыўся да гэтага ў Ульскім СПТВ і вярнуўся напярэдадні ў гаспадарку з пасведчаннем механізатара шырокага профілю.

Выбар Трошчанкі здзівіць мог толькі людзей недасведчаных. У сям'і патомных хлебаробаў Міхаіла Дзмітрыевіча і Лідзіі Сяргееўны Вараб'ёвых шасцёра дзяцей, і чацвёра старэйшых да таго часу, як і бацькі, працавалі ўжо ў калгасе: Аляксандр – слесарам у жывёлагадоўлі, Сяргей – газаэлектразваршчыкам, Валерый – механізатарам, Антаніна – у паляводстве. І ніхто не мог сказаць аб іх дрэннага слова: даручаную справу ўсе выконваюць добрасумленна і якасна, ніякай работай не грэбуюць. А Юрый, пяты з дынастыі малодшых Вараб'ёвых, уступаў у самастойнае працоўнае жыццё на зямлі сваіх бацькоў. Забягаючы крыху наперад, скажам, што і самы меншы Вараб'ёў, Вячаслаў, неўзабаве скончыў сельскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча і таксама вярнуўся ў сваю гаспадарку.

Такім чынам, Міхаіл Трошчанка добра ведаў, каму давяраў свой трактар. І Юрыю Вараб'ёву, трэба прама сказаць, вельмі пашанцавала. Бо Міхаіл Васільевіч, як старэйшы і вопытны таварыш, узяў над юнаком шэфства: дапамагаў пастаянна – дзе слушнай парадай, а дзе і справай.

А неўзабаве прызвалі Юрыя ў рады Савецкай Арміі. І давялося служыць у Афганістане, у саставе абмежаванага кантынгента савецкіх войск. Вайсковая часць, у якой служыў Юрый, размяшчалася непадалёку ад граніцы з Пакістанам. А гэта былі найбольш гарачыя і небяспечныя месцы, бо менавіта тут фарміраваліся і ўзбройваліся сілы контррэвалюцыі. Спачатку Юрыя

прызначылі камандзірам аддзялення, а на другім годзе службы ён стаў намеснікам камандзіра ўзвода. З цеплыней успамінае цяпер сваіх баявых сяброў.

– Усе мы сталі там нібы родныя браты, – расказвае Юрый. – З Аляксандрам Ксенафонтавым, Валерыем Гарбачовым, Аляксандрам Лотаравым перапісваемся і цяпер. Цяжка ўспамінаць тых, хто загінуў у баях з узброенымі да зубоў бандамі душманаў. Адзін з маіх сяброў неасцярожна закурыў ноччу на вуліцы цыгарэту, і яго тут жа напаткала куля варожага снайпера. Асабліва актывізавалася контррэвалюцыя ў дні міжнародных і рэвалюцыйных свят: з горнай мясцовасці абстрэл вялі з мінамётаў, гармат, невялікімі ракетамі...

А калі я пацікавіўся ў Юрыя аб адносінах да савецкіх салдат мірнага афганскага насельніцтва, вочы юнака адразу пасвятлелі.

– Самыя дружалюбныя. Сельскія жыхары запрашалі нас да сябе ў госці, частавалі ўсім, што мелі. Бачылі яны, што ў любы час сутак узніманіся па трывозе нашы рабяты, рызыкавалі сваім жыццём, каб абараніць інтарэсы простых афганскіх людзей.

У час службы ў Савецкай Арміі Юрый Вараб'ёў стаў камуністам. Рэкамендацыі яму далі камсамольская арганізацыя, камандзір і старшына роты. За мужнасць і адвагу, праяўленыя пры выкананні баявых заданняў, малады камуніст узнагароджан медалём«За баявыя заслугі».

Пасля заканчэння тэрміну службы вярнуўся Юрый Вараб'ёў у свой родны калектыў. Цяпер ён ужо афіцэр запасу – мае воінскае званне малодшага лейтэнанта. Сябры па рабоце сустрэлі Юрыя з радасцю і павагай. З узнагародай і вяртаннем у калгас адным з першых павіншаваў юнака яго першы настаўнік у механізатарскай справе член КПСС Міхаіл Трошчанка.

Праўленне калгаса выдзеліла Юрыю новенькі Т-150. І любую работу малады механізатар выконвае добрасумленна і якасна. Вясной мінулага года ён вызначыўся ў дні сяўбы, потым ударна працаваў на нарыхтоўцы кармоў, асвоіў работу на комплексе Е-302. А камсамольцы калгаса выбралі Юрыя членам камітэта камсамола. І да грамадскай работы ён ставіцца гэтак жа добрасумленна, як і да вытворчай. Захапляецца спортам, ініцыятар розных добрых спраў сельскай моладзі. У канцы размовы я спытаў у Юрыя, якая была ў яго мара ў час вучобы ў школе, кім хацелася стаць у юнацкія гады.

– Ведаеце, – проста адказаў ён, – падабалася мне праца на зямлі, увесь час цягнула да тэхнікі, да збожжавых палеткаў. Відаць, таму, што ўся сям'я моцна прывязана да гэтай справы. Вось і марыў стаць аграномам.

– І як жа з гэтай марай цяпер?

– А цяпер яна стала значна бліжэйшай. У мінулым годзе я паступіў завочна ў Лужаснянскі саўгастэхнікум і менавіта на аграномічнае аддзяленне. Неўзабаве вось паеду на чарговую сесію.

Потым давялося гутарыць з сакратаром парткома калгаса імя Леніна У. Мартынавым.

– Выдатны механізатар, вельмі надзейны таварыш,– сказаў пра Юрыя Уладзімір Уладзіміравіч. – Любая справа гарыць у яго руках. Гэтым жа – добрасумленнасцю і стараннасцю – вызначаецца і ўся вялікая хлебаробская дынастыя Вараб'ёвых.

**Э. Дамарацкі**

**На здымку:** механізатар калгаса імя Леніна, член КПСС Юрый Вараб'ёў

**Фота аўтара**